УДК 930 (ИБеи)+357.71

*І.І. Шаўчук*

## ГУМАНІТАРНЫЯ НАВУКІ: ВЫЗНАЧЭННЕ ПАНЯЦЦЯ

Паняцці "гуманітарныя навукі" і "сацыяльныя навукі", як правіла, разглядаюцца ў якасці апрыерна зразумелых, таму практычна кожным даследчыкам уносіцца сваё ўласнае разуменне іх сутнасці. У выніку навуковая літаратура прадстаўляе розныя, часам супярэчлівыя, пазіцыі па дадзеным пытанні. У сувязі з гэтым у артыкуле, зыходзячы з патрэбаў навукова-гістарычнай і навуказнаўчай практыкі, прадпрымаецца спроба больш дакладнай дыферэнцыяцыі акрэсленых паняццяў.

У навуковай практыцы паняцці "гуманітарныя навукі" і "сацыяльныя навукі" ўжываюцца, як правіла, у якасці зразумелых на інтуітыўным узроўні. Аднак інтуіцыя ў кожнага даследчыка свая, індывідуальная, што, як паказвае тая самая практыка, нараджае пэўную блытаніну ў выкарыстанні і разуменні азначаных паняццяў і адпаведна з'яў, якія за імі стаяць. У дадзеным выпадку мы не будзем удавацца ў падрабязнасці філасофскага асэнсавання заяўленай тэмы, а звернем увагу на практычнае стаўленне да праблемы ў беларускай навукова-гістарычнай і навуказнаўчай практыцы.

Так, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі мае ў сваім складзе Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў, якое аб'ядноўвае інстытуты гісторыі, сацыялогіі, права, літаратуры, філасофіі, эканомікі і г.д. Вышэйшы атэстацыйны камітэт пры пераліку экспертных саветаў па гуманітарных навуках адносіць да апошніх гістарычныя навукі, юрыдычныя навукі, філалогію, сацыялогію і паліталогію, эканоміку, педагогіку, філасофію, псіхалогію, мастацтвазнаўства і культуралогію [1, с. 33–38]. Падобная пазіцыя выказана ў 1998 г. у артыкулах тагачаснага прэзідэнта Акадэміі навук А. Вайтовіча і акадэмічных навукоўцаў А. Падлужнага, Г. Карзенкі і І. Багданавай, В. Шчэрбіна [2; 3; 4; 5].

Дзве беларускія гісторыка-метадалагічныя публікацыі таксама не надаюць спецыяльнай увагі пытанню вызначэння зместу гуманітарнага і сацыяльнага пазнання. Першая з іх утрымлівае асобны раздзел "Класіфікацыя навук. Месца гісторыі ў сістэме грамадска-гуманітарных ведаў", у якім навукі падзелены на тры групы:

1) філасофія – агульная навука,
2) прыродазнаўства,
3) грамадскія навукі, якія вывучаюць развіццё грамадства і яго розныя структурныя элементы [6, с. 28].

Другая праца, не надаючы асобнай увагі класіфікацыі навук, абмяжоўваецца канстатацыяй, што "сталыя і паслядоўныя кантакты гісторыі з сацыяльнымі і гуманітарнымі дысцыплінамі (а таксама літаратурай і рознымі відамі мастацтва) мадыфікуюць аблічча гісторыі" [7, с. 155].

Такім чынам, сёння мы назіраем падыходы, характэрныя для савецкага перыяду нашай гісторыі, калі мела месца адназначнае атаясамленне і ўзаемазамяняльнасць вызначэнняў "гуманітарны" і "грамадскі (грамадазнаўчы)". Гэта зафіксавана ў энцыклапедычных і даведачных выданнях таго часу. Так, "Советский энциклопедический словарь" падае наступную трактоўку: "Гуманітарныя навукі – грамадскія навукі (гісторыя, палітэканомія, філалогія і інш.) у адрозненне ад прыродазнаўчых і тэхнічных навук" [8 с. 353] Літаральна падобнае ўтрымліваецца і ў

іншых публікацыях. Беларускае энцыклапедычнае выданне больш разгорнута прадставіла грамадскія навукі, прадметам вывучэння якіх вызначаны стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму, развіццё сацыялістычнага ладу жыцця, змены сацыяльнай структуры, паглыбленне інтэрнацыяналізацыі грамадскага жыцця, фарміравання новага чалавека, марксісцка-ленінскага светапогляду, навуковых асноў выхаваўчай і ідэалагічнай работы, праблем гісторыі культуры, мовы, літаратуры і мастацтва, гісторыі КПСС, КПБ, Беларусі, грамадскай думкі, дзяржавы і права і інш. [9, с. 39]. “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя”, гаворачы толькі пра гуманітарную адукацыю, тым не менш, таксама атаясамлівае яе з “... адукацыяй у галіне грамадскіх навук”, уключаючы сюды гісторыю, журналістыку, філасофію, эканоміку, педагогіку, права, філалогію [10, с. 85].

Праўда, і ў савецкі час у падобнага кшталту выданнях можна было сустрэць адрозныя меркаванні. У прыватнасці, у “Oxford student’s dictionary of current English” (М., 1984). гуманітарныя навукі адназначна характарызаваліся як галіна даследавання, датычная мастацтва, літаратуры, філасофіі і гісторыі [11]. Зразумела, што ў дадзеным выпадку ўкладальнік – англійскі мовазнаўца А. Хорнбі – трактаваў паняцце, зыходзячы з еўрапейскіх навуказнаўчых напрацовак. Блізкай да такога разумення можна лічыць фармулёўку “Словаря русского языка” С. Ожагава, дзе да сферы гуманітарных навук аднесена вывучэнне гісторыі і культуры народа ў адрозненне ад навук аб прыродзе [12, с. 128].

Пры тым, што грамадазнаўства відавочна складаецца з двух узаемадапаўняльных, але не ідэнтычных частак – гуманітарных і сацыяльных навук, яны ў папярэдняй і сучаснай практыцы ўжываюцца ў нас, як правіла, у якасці ўзаемазамяняльных. Для марксісцкага бачання свету гэта натуральна. Эканамічная дэтэрмінацыя ім гістарычнага працэсу абумовіла выснову аб існаванні выключна аб’ектыўных сацыяльных законаў у развіцці чалавечай супольнасці. Адсюль узнікае супярэчнасць: абагульненая маса індывідаў у сацыяльным руху (рэчаіснасці) – індывід. Экстрапаляцыя законаў развіцця прыроды на грамадства і сацыяльна-эканамічная дэтэрмінацыя не пакідалі месца для разумення чалавека, ролі яго ўнутранага свету і ўласных матываў у сацыяльнай дзейнасці. Таму не ўзнікала практычнай патрэбы ў класіфікацыі грамадазнаўства, што складалася з апрыёрна зразумелага колькаснага набору навуковых дысцыплін, шэраг якіх прадстаўлены вышэй.

Такое разуменне наўпрост дэкларавалася ў тагачасных публікацыях пасля больш-менш трывалага ўсталявання марксісцкіх філасофскіх падыходаў. Таму, каб больш поўна зразумець карані пэўных сённяшніх падыходаў да вырашення гэтага пытання, прывядзём аб’ёмную цытату з першага выдання “Большой Советской Энциклопедии”. Паводле яе, гуманітарныя навукі – “па састарэлым дзяленні, група навук, у склад якой уваходзілі грамадскія, гістарычныя, філалагічныя і філасофскія дысцыпліны. Назва гэта (studia humaniora) укаранілася яшчэ ў сяр. вв. і асабліва ў эпоху Адраджэння, калі словам humanitas вызначалася ўся сума ўласцівасцяў чалавечага розуму, пачуцця, волі. ... Гуманітарныя навукі ахоплівалі ўсю сукупнасць навук, якія вывучаюць чалавека як сацыяльную істоту. Наўзамен састарэлага тэрміна гуманітарныя навукі марксісцкая метадалогія вылучае тэрмін сацыяльныя навукі, які ахоплівае ўсю сукупнасць навук аб грамадстве, пачынаючы ад навук, якія вывучаюць базіс, і заканчваючы навукамі аб вышэйшых ідэалагічных надбудовах” [13, с. 798].

Аднак савецкія, расійскія ў прыватнасці, вучоныя да гэтай праблемы ўсё ж звярталіся. Відавочна, чыста філасофскі характар, навукова-гістарычны і навуказнаўчы матыў іх цікавасці да тэмы, не адрасаванай шырокаму колу чытачоў, дазваляў рабіць гэта, паколькі непасрэдным чынам не закранаў палітыка-ідэалагічных і выхаваўчых функцый тагачаснага грамадазнаўства. Так, У. Вярнадскі яшчэ ў другой палове 1930-х

гадоў пісаў: “У значнай ступені, зыходзячы з праяў, уласцівых чалавеку, і ўсведамляючы альбо прымаючы асноўную тоеснасць жыцця для ўсіх жывых арганізмаў, стварылася ў навуцы велізарная вобласць навук гуманітарных, у якіх на першае месца становяцца такія праяўленні жывых арганізмаў, якія для пераважнай большасці іх не існуюць, а часта ўласцівыя толькі чалавеку” [14, с. 487]. Паводле ўплыву на будову наасферы ён адрозніваў дзве вобласці чалавечага розуму: навукі, агульныя для ўсёй рэчаіснасці (фізіка, астраномія, хімія, матэматыка), і навукі аб Зямлі (навукі біялагічныя, геалагічныя і гуманітарныя) [14, с. 463]. Беларускія навукоўцы ў даваенны перыяд таксама не гублялі цікавасці да зазначанай праблемы. Напрыклад, А. Вазнясенскі лічыў неабходным падыходзіць да вывучэння гісторыі літаратуры з пазіцый падзелу ўсіх навук на дакладныя і недакладныя, “якія абдымаюць дысцыпліны гуманітарныя”, непасрэдна спасылаючыся пры гэтым на Г. Рыкерта і В. Віндэльбанда. Разам з тым, магчыма не цалкам зразумеўшы апошняга, настойваў на тым, што ў гісторыі літаратуры спалучаюцца “абодва моманты – ідэаграфічны і номатэтычны” [15, с. 5, 7].

На нашу думку аўтара, найбольш дакладнае ў найноўшы час вызначэнне прадмета і метаду гуманітарных навук, паводле чаго агульнапрынята ажыццяўляць класіфікацыю асобных навук, з якіх складаецца адзіны суцэльны феномен дзейнасці чалавецтва, названы навукай, належыць яшчэ аднаму вядомаму расійскаму даследчыку – М. Бахціну. Адпаведна яго меркаванню, прадметам гуманітарных навук з’яўляецца выразнае і гаворачае быццё. Яно ніколі не супадае само з сабой і таму невычэрпнае ў сваім сэнсе і значэнні [16, с. 430]. Каб сфармуляваць метад, даследчыку неабходна вызначыцца з першасным матэрыялам, да якога прыкласці гэты метад для раскрыцця прадмета. Такім матэрыялам для М. Бахціна служыць тэкст: “тэкст з’яўляецца той непасрэднай рэчаіснасцю (рэчаіснасцю думкі і перажыванняў), з якой толькі і здольныя зыходзіць гэтыя дысцыпліны і гэтае мысленне. Дзе няма тэксту, там няма і аб’екта для даследавання і мыслення” [16, с. 297]. Мысленне ж уяўляе своеасаблівы дыялог, праяўлены праз узаемадачыненне тэксту і кантэксту, які ствараецца і абрамляе тэкст. Зыходзячы са сказанага, гуманітарныя навукі вызначаюцца як навукі пра чалавека ў ягонай спецыфіцы, але не пра бязмоўную рэч і прыродную з’яву. Чалавек у яго чалавечай спецыфіцы заўсёды адлюстроўвае сябе (гаворыць), гэта значыць стварае тэкст. Калі чалавек вывучаецца па-за тэкстам і незалежна ад яго, гэта ўжо не гуманітарныя навукі [16, с. 301].

Выходзіць, М. Бахцін развівае ідэі, сфармуляваныя ў канцы XIX – першай трэці XX стст. В. Дзільтэем, Г. Рыкертам, В. Віндэльбандам і скіраваныя на доказ магчымасці выдзялення і самастойнага існавання групы гуманітарных навуковых дысцыплін. Зразумела, вядомыя спробы класіфікацыі навук прадпрымаліся яшчэ Арыстоцелем, а пазней Ф. Бэканам, Г. Гегелем, А. Контам і інш. А. Конт, напрыклад, пры групоўцы навук з трох пар апошняй вызначыў біёлага-сацыялагічную. Перад тым Г. Гегель у “кампетэнцыю” аб’ектыўнага духа ўводзіў сацыяльна-гістарычнае жыццё чалавека і абсалютнага духа – такія формы яго самаўсведамлення, як мастацтва, рэлігія, філасофія [17, с. 26; 8, с. 285]. Падаецца, пачынаючы з В. Дзільтэя філасофская думка пэўнага кірунку пры дыферэнцыяцыі навук зыходзіла з паняцця “філалогія”, характэрнага для XVII–XVIII стст., як навукі пра старажытную культуру (мову, літаратуру, гісторыю, філасофію, мастацтва ў іх узаемасувязі). Дарэчы, у цяперашні час некаторыя расійскія энцыклапедычныя выданні характарызуюць філалогію як галіну ведаў, што вывучае пісьмовыя тэксты і на падставе іх змястоўнага, моўнага і стылістычнага аналізу – гісторыю і сутнасць духоўнай культуры грамадства. У значнай ступені гэта пераклікаецца з трактоўкай паняцця “гуманітарны” – звернуты да чалавечай асобы. Адсюль гуманітарныя навукі – філалогія, гісторыя, мастацтвазнаўства і г.д. [18].

Такім чынам, раздзяленне сацыяльнага і гуманітарнага пазнання захоўваецца ў структурах традыцыйнага падзелу працы паміж дысцыплінамі, у адпаведных адукацыйных і кіруючых інстытутах. Такая самая думка выказана ў "Современном философском словаре". Адначасова там выказана меркаванне, што ў плане даследавання праблем, якія выходзяць за межы прыватнага прадмета асобнай дысцыпліны, чым з'яўляюцца ўсе сацыяльныя праблемы ў якасці праблемы супольнага і індывідуальнага быцця людзей, падзел сацыяльнага і гуманітарнага пазнання губляе сэнс [19, с. 171]. Гэта супадае з меркаваннем, выказаным у 1970 г. у зборніку UNESCO "Асноўныя тэндэнцыі даследаванняў у сацыяльных і гуманітарных навуках" артыкулам "Месца навук аб чалавеку ў сістэме навук": "... нельга зрабіць дакладнага вызначэння паміж дысцыплінамі, на якія мы часта спасылаемся як на "сацыяльныя навукі" і на тыя, якія вядомыя як "гуманітарныя навукі", паколькі сацыяльныя з'явы залежаць ад усіх чалавечых характарыстык ... гуманітарныя навукі ёсць цалкам сацыяльныя, падзел залежыць ад таго, з якога пункту гледжання яны разглядаюцца" [20, p. 11].

Праблеме падзелу гуманітарнага і сацыяльнага надаецца даследчыкамі значная ўвага ў іншых краінах свету і цяпер. Так, І. Валерстэйн лічыць, што сацыяльныя навукі выдзеліліся як прамежкавая дысцыпліна паміж прыродазнаўчымі і гуманітарнымі навукамі ў сувязі з іх інтэлектуальным і арганізацыйным падзелам у канцы XVIII ст. [21, p. 42]. Краіны-ўдзельніцы Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (Organization for Economic Co-operation and Development – OECD) з 1994 г. прытрымліваюцца падзелу навук на шэсць асноўных накірункаў: прыродазнаўчыя, сельскагаспадарчыя, інжынерыя і тэхналогіі, медыцынскія, сацыяльныя, гуманітарныя. Ён быў распрацаваны ў адпаведнасці са сфармуляванай UNESCO ў 1978 г. "Рэкамендацыяй адносна міжнароднай стандартызацыі статыстыкі і тэхналогіі" (у складзе OECD на 1999 г. налічвалася 29 членаў з Еўропы, Азіі, Аўстраліі, Цэнтральнай і Паўночнай Амерыкі, у тым ліку з былога "сацыялістычнага лагера" – Чэхія, Венгрыя, Польшча). Годам раней UNESCO распрацавала Інтэрнацыянальны стандарт класіфікацыі адукацыі (International Standard Classification of Education – ISCED), які даволі шырока трактаваў межы сацыяльных навук, але выключыў з іх складу такія дысцыпліны, як гісторыя, літаратура і філасофія, адносячы апошнія да гуманітарных навук. Паводле яго, пасля 1997 г. клас "сацыяльныя і біхевіяральныя навукі" складаецца з 12 дысцыплін: эканоміка, палітычныя навукі, сацыялогія, дэмаграфія, антрапалогія (без фізічнай), этналогія, футуралогія, псіхалогія, геаграфія (без фізічнай), даследаванні міру і канфліктаў, правы чалавека [22, p. 60, 59].

Праз дваццаць гадоў пасля выхаду ў свет БелСЭ ў новай рэдакцыі беларускай энцыклапедыі (відаць, па традыцыі) зноў прысутнічае толькі артыкул "Гуманітарная адукацыя". Але ў ім ужо больш канкрэтна названы гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, рэлігіязнаўства, выяўленчае мастацтва, музыка, замежныя і родная мовы) і сацыяльныя навукі (псіхалогія, сацыялогія, антрапалогія, лінгвістыка, палітычныя дысцыпліны) [23, с. 531]. Пагаджаючыся, у прынцыпе, з такім падзелам, неабходна звярнуць увагу на адну канстатацыю аўтара гэтага артыкулаў сувязі з яго назвай. Так, А. Макараў сцвярджае, што ў "... краінах Заходняй Еўропы і ЗША да гуманітарных дысцыплін адносяць" – вышэйназваныя навукі. Значыць, дысцыпліны разглядаюцца ў якасці вучэбных. У дадзеным выпадку мы схіляемся да слушнага, на нашу думку, меркавання, што ўтрымліваецца ў вышэйзгаданым зборніку UNESCO за 1970 г.: размеркаванне дысцыплін на факультэтах універсітэтаў розных краін моцна адрозніваецца, а таму не можа быць выкарыстана ў якасці асновы для класіфікацыі навук [20, p. 11]. Дарэчы, і не выкарыстоўваецца.

На міжнародным узроўні прафесійныя арганізацыі, дзе прадстаўлены гуманітарныя навукі, аб'яднаныя ў Міжнародную раду філасофіі і гуманітарных

даследаванняў (International Council of Philosophy and Humanistic Studies – ICPHS). Нарэшце, у UNESCO адпаведная структура называецца Сектар сацыяльных і гуманітарных навук (Sector of Social and Human Sciences).

Тым не менш аднастайнасці ў разуменні сферы гуманітарных і сацыяльных навук у сябраў OECD не назіраецца. Так, у Германіі сацыяльныя навукі адносяць да эмпірычных, а гуманітарныя (неэмпірычныя) называюцца “навукі аб духоўных і ментальных праблемах”. У Францыі не існуе дакладнасці ў класіфікацыі дысцыплін (і адпаведна ў тэрміналогіі) паміж сацыяльнымі і гуманітарнымі навукамі. Два галоўныя нацыянальныя інстытуты гэтай краіны – Maison des Sciences de l’Homm (MSH) і Ecole de Hautes Etudes en Sciences Sociales (EHESS) – працуюць па ўсім комплексе гуманітарных і сацыяльных навук [20, р. 11]. Па традыцыі ў кола даследчых інтарэсаў членаў “Французскага таварыства гісторыкаў гуманітарных навук” (SFHSH) уваходзяць антрапалогія, генетыка, дэмаграфія, лінгвістыка, права, крыміналістыка, эканоміка, экалогія, паліталогія, гісторыя – усяго 18 дысцыплін [24, с. 202]. Дарэчы, паводле сённяшніх навуказнаўчых меркаванняў, эпістэмалагічная лінія падзелу ўсё больш праяўляецца ўнутры саміх гэтых навуковых дысцыплін, чым паміж імі, дзе яна больш ці менш устаялася. Хоць назіраюцца змены пазіцый і тут. Так, пры стварэнні ICPHS у 1949 г. гісторыя паўсюдна лічылася гуманітарнай дысцыплінай. З 1960-х гадоў сітуацыя паступова мянялася, і сёння, паводле некаторых метадалагічных падыходаў, гісторыя належыць да сацыяльных навук. Таксама і з археалогіяй, калі яна ад дагістарычнай да індустрыяльнай залічваецца да прадмета сацыяльных навук, а традыцыйная, манументальная ўсё яшчэ застаецца сферай гуманітарных [20, р. 12]. На наш погляд, сёння, калі яўна ўзрастаюць патрэбы і тэндэнцыі інтэграцыі дысцыплінарных і міждысцыплінарных даследаванняў, і залішняя дэталізацыя, і драбненне прадмета вывучэння выглядаюць праблематычнымі.

У той жа час уяўляецца неправамерным разглядаць комплекс грамадазнаўства выключна унітарным. Зыходзячы з прадмета і метаду даследавання, ён складаецца з сацыяльных і гуманітарных дысцыплін (навук). Гэта, на наш погляд, дазваляе з практычных пазіцый навуказнаўчага альбо навукова-гістарычнага даследавання больш ці менш дакладна дыферэнцыраваць іх. Тым больш калі гаворка ідзе пра функцыянаванне сацыяльнага інстытута навукі ў 1920–1930-я гады – час росквіту ідэй, выказаны і філасофскі абгрунтаваныя прадстаўнікамі бадэнскай школы і якія не абмінулі сваім уздзеяннем нават тагачаснага СССР. Фактычна такі самы падыход, зыходзячы з метадалагічных і ўжытковых пазіцый, апошнім часам выказваўся ў расійскіх гістарычна-статыстычных і навуказнаўчых публікацыях [25, с. 54–56; 26]. Беларуская навукова-гістарычная і навуказнаўчая літаратура канкрэтна не разглядала і не мае сёння пэўных, спецыяльна разгледжаных і філасофскі асэнсаваных, пазіцый па дадзеным пытанні. У сувязі з такім станам рэчаў уяўляецца прымальным і, зыходзячы з навуказнаўчай і навукова-гістарычнай практыкі, апраўданым аднесці да гуманітарных навук наступныя дысцыпліны: комплекс гістарычных навук, у тым ліку гісторыю навукі ў шырокім сэнсе (разам з гісторыяй сацыяльных і гуманітарных навук, фізікі, хіміі, матэматыкі, біялогіі і г.д.), навуказнаўства, мовазнаўства, літаратуразнаўства, філасофію (нягледзячы на яе пэўную спецыфіку, а таму некаторую ўмоўнасць уключэння), з яшчэ большай доляй умоўнасці – тэалогію, паколькі па дадзеным пытанні ў навуковым свеце маюць месца і большыя разыходжанні (“навука–ненавука”), хаць агульнапрызнана, што яе рацыянальныя прыёмы для вывучэння тэкстаў развіваліся, нарадзіўшы літаратуразнаўства, археаграфію, класічную філалогію, лінгвістыку і інш. [27].

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Сорокин, А. Н. Экспертные советы по гуманитарным наукам : опыт и проблемы / А. Н. Сорокин // Атэстацыя. – 1998. – № 3. – С. 33–38.

2. Вайтовіч, А. П. Гуманітарныя і сацыяльныя веды ў сістэме Акадэміі навук / А. П. Вайтовіч // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад. В. К. Шчэрбін ; нав. рэд. Л. Ф. Яўменаў. – Мінск : АНІГН НАНБ, 1998. – С. 4–13.

3. Падлужны, А. І. Стан і развіццё гуманітарных навук у Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі / А. І. Падлужны // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад. В. К. Шчэрбін ; нав. рэд. Л. Ф. Яўменаў. – Мінск : АНІГН НАНБ, 1998. – С. 14–19.

4. Корзенко, Г. В. Кадровый потенциал гуманитарных и социальных наук : краткий очерк развития / Г. В. Корзенко, И. Ф. Богданова // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад. В. К. Шчэрбін ; нав. рэд. Л. Ф. Яўменаў. – Мінск : АНІГН НАНБ, 1998. – С. 43–51.

5. Шчэрбін, В. К. Параўнальны аналіз развіцця гуманітарных і сацыяльных даследаванняў у Акадэміях навук краін СНД у постсавецкі перыяд / В. К. Шчэрбін // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад. В. К. Шчэрбін ; нав. рэд. Л. Ф. Яўменаў. – Мінск : АНІГН НАНБ, 1998. – С. 20–32.

6. Методология истории : учеб. пособие для студентов вузов / А. Н. Нечухрин [и др.] ; под ред. А. Н. Алпеева [и др.]. – Минск : ТетраСистемс, 1996. – 240 с.

7. Методологические проблемы истории : учеб. пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей, обеспечивающих получение высш. образования / В. Н. Сидорцов [и др.] ; под общ. ред. В. Н. Сидорцова. – Минск : ТетраСистемс, 2006. – 352 с.

8. Гуманитарный // Советский энциклопедический словарь. – М., 1989. – С. 353.

9. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск : БелСЭ, 1978. – 616 с.

10. Гуманітарная адукацыя // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. – Мінск, 1971. – Т. 4. – 608 с.

11. Hornby, A. S. Oxford student's dictionary of current English / A. S. Hornby. – Moskow : Prosveshchenie Publisher ; Oxford University Press. – 769 p.

12. Ожегов, С. И. Словарь русского языка / С. И. Ожегов ; под ред. Н. Ю. Шведовой. – 18-е изд., стереотип. – М. : Рус. яз., 1987. – 797 с.

13. Гуманитарные науки // Большая Советская Энциклопедия. – М., 1930. – Т. 19. – С. 798.

14. Вернадский, В. И. О науке. Научное знание. Научное творчество. Научная мысль / В. И. Вернадский. – Дубна : Феникс, 1997. – Т. 1. – 576 с.

15. Вазьнясенскі, А. Н. Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускае навукі аб літаратуры / А. Н. Вазьнясенскі. – Менск, 1927. – 23 с.

16. Бахтин, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – 2-е изд. – М. : Искусство, 1986. – 445 с.

17. Кохановский, В. П. Философия науки : учеб. пособие / В. П. Кохановский, В. И. Пржиленский, Е. А. Сергодеева – М. : МарТ, ; Ростов н/Д : МарТ, 2005. – 496 с.

18. Большой энциклопедический словарь. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Большая Российская энциклопедия : СПб. : Норинт, 2004. – 1456 с.

19. Кемеров, В. Е. Гуманитарное и социальное познание / В. Е. Кемеров // Современный философский словарь. – 3-е изд., исп. и доп. – М. : Академический проект, 2004. – 864 с.

20. Цыт. па: Kazancigil, A. Introduction / A. Kazancigil, D. Makinson // World Social Science Report. – France : UNESCO Publishing / Elsevier, 1999. – P. 11–14.

21. Wallerstein, I. Social sciences in the twenty-first century / I. Wallerstein // World Social Science Report. – France : UNESCO Publishing / Elsevier, 1999. – P. 42–49.

22. Oba, J. The social sciences in OECD countries / J. Oba // World Social Science Report. – France : UNESCO Publishing / Elsevier, 1999. – P. 58–73.

23. Макараў, А. В. Гуманітарная адукацыя / А. В. Макараў // Беларус. энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 531–576.

24. Володарская, Е. А. Французское общество историков гуманитарных наук (SFHSH) / Е. А. Володарская // Вопросы истории естествознания и техники. – 2001. – № 1. – С. 202–203.

25. Москвичёв, Л. Н. Воспроизводство научного потенциала социальных и гуманитарных дисциплин / Л. Н. Москвичёв // Социологические исследования. – 1998. – № 5. – С. 54–64.

26. Аллахвердян, А. Г. К проблемам дифференциации общественных наук на социальные и гуманитарные : методологические и прикладные аспекты / А. Г. Аллахвердян // Годичная научная конференция. Институт истории естествознания и техники им. С. И. Вавилова [Электронный ресурс]. – Электрон. дан. и прогр. (94,5 Мб). – М., 2005. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM): зв., цв.

27. Аксёнов, Г. П. Личность, наука и ноосфера возникают одновременно / Г. П. Аксёнов // Годичная научная конференция. Институт истории естествознания и техники им. С. И. Вавилова [Электронный ресурс]. – Электрон. дан. и прогр. (94,5 Мб). – М., 2005. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM): зв., цв.

***Shauchuk I.I.*** **The humanities: the notion definition**

The notions of the humanities and social sciences are considered as a priori understandable once and therefore actually every researcher introduce his own interpretation in their essence. As result the scientific literature gives various and sometimes contradictory views concerning the designated question. In a view of this there is made an attempt a sign more careful differentiation of the denoted notions. This is determined by the requirements of the historical-scientific and science of science practice.